ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.В.Клімовіч
“23” __________ 2026 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк “Лэпбук – гісторыя #4Рэгіёна”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці “Лэпбук – гісторыя #4Рэгіёна” (далей – Конкурс).

2. Арганізатарамі Конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і дзяржаўная ўстанова культуры (далей – ДУК) “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага” (далей – арганізатары Конкурсу).

3. Арганізатары Конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на распаўсюджванне інфармацыі аб матэрыялах Конкурсу ў сетцы Інтэрнэт.

4. За творчыя работы ганарары аўтарам конкурсных матэрыялаў не выплачваюцца.

5. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт) (дадатак 1), для падвядзення вынікаў – журы (дадатак 2).

6. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення Конкурсу, а таксама перанос даты падвядзення вынікаў Конкурсу.

7. Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення творчага падыходу і прафесійных навыкаў бібліятэчных спецыялістаў у арганізацыі чытання шляхам стварэння інавацыйных візуалізаваных прадуктаў – лэпбукаў.

8. Задачы Конкурсу: натхніць на стварэнне ўнікальных праектаў краязнаўчага характару, павысіць цікавасць карыстальнікаў бібліятэк да вывучэння мясцовай гісторыі і культуры пры дапамозе лэпбука, паглыбіць веды па выбранай тэме і пашырыць кругагляд.

9. Конкурс праводзіцца з 1 лютага да 31 мая 2026 г.

10. У Конкурсе прымаюць удзел публічныя бібліятэкі Гродзенскай вобласці (далей – удзельнікі).

11. Конкурс праводзіцца па дзвюх намінацыях:

“Гістарычнае Прынямонне” – творчае раскрыццё важных падзей, унікальнай архітэктуры і багатай гістарычнай спадчыны, мясцін, цікавых фактаў аб рэгіёне;

“Культурная Гродзеншчына” – персаналіі – гістарычная фігура, сучасны дзеяч, музыкант, мастак, мясцовы аўтар і яго творчасць.

12. Па выніках Конкурсу журы вызначае пераможцаў 1-а, 2-а і 3-га месцаў у кожнай намінацыі.

13. Удзельнікам Конкурсу неабходна стварыць лэпбукі – інтэрактыўныя кнігі для развіцця, якія складаюцца з некалькіх разваротаў. Кожны разварот можа мець свой раздзел або тэму.

14. Колькасць работ, якія прадстаўляюцца на Конкурс, ад бібліятэчнай сістэмы – не менш за дзве ў кожнай намінацыі.

15. Патрабаванні да творчых работ:

лэпбукі могуць быць аформлены ў выглядзе інтэрактыўных папак з кішэнькамі, акенцамі, рухомымі дэталямі (напрыклад, згортваюцца элементы або адкідныя старонкі), устаўкамі, якія можна даставаць, раскладваць, складаць па сваім меркаванні, карткамі з тэкстам, ілюстрацыямі і дадатковай інфармацыяй;

варыятыўнасць – формы прадстаўлення інфармацыі могуць быць рознымі: тэксты, малюнкі, карцінкі або фотаздымкі, гульні. Усё размяшчаецца на розных элементах: у нататніках, міні-кніжках, канвертыках розных фармаў і г.д.;

яркае афармленне, гарманічныя колеры і дакладная структура;

адпаведнасць заяўленай намінацыі.

Лэпбукі павінны быць зроблены з трывалых матэрыялаў любой геаметрычнай формы, не прагінацца, адлюстроўваць пазначаную тэматыку. Для стварэння асновы магчыма выкарыстанне шчыльнага кардона, у якасці старонак – каляровая ці фактурная папера.

Памеры творчых работ: максімальны – А3, мінімальны – А5.

16. Пры падвядзенні вынікаў журы будуць выкарыстоўваць наступныя крытэрыі ацэнкі:

тэхнічнае выкананне: якасць і візуальная акуратнасць работы, адсутнасць памылак, дызайн, вобразы, стыль;

звязанасць тэматыцы: наколькі праца дакладна суадносіцца з заяўленай намінацыяй, падбор фактычнага матэрыялу выбранай тэмай;

дарэчнасць размяшчэння ілюстрацый і графічных элементаў;

лёгкае ўспрыманне зместу працы мэтавай аўдыторыяй;

крэатыўнасць і арыгінальнасць: унікальнасць падыходу да тэмы, навізна прадстаўленых ідэй, эстэтычная прывабнасць працы;

арганізацыя і структураванасць матэрыялу;

мэтазгоднасць прыёмаў і творчых заданняў у арганізацыі лэпбука.

Дадзеныя крытэрыі дапамогуць комплексна ацаніць творчыя работы ўдзельнікаў, улічваючы як мастацкія, так і змястоўныя аспекты.

17. Матэрыялы на Конкурс павінны ўключаць:

заяўку на ўдзел у Конкурсе (дадатак 3);

наяўнасць пашпарта (назва лэпбука, змест (пералік раздзелаў, апісанне гульняў і правілаў, якія ўваходзяць у гэты раздзел), кароткае тлумачэнне працы);

замацаваную этыкетку на адваротным баку творчай працы з указаннем назвы, тэмы, аўтара.

18. Заяўкі, пашпарты лэпбукаў да Конкурсу ў друкаваным выглядзе і работы прадстаўляюцца не пазней 20 мая 2026 г. у аргкамітэт на адрас: г. Гродна, вул. Карбышава, 17 з паметкай “На конкурс”.

19. Ажыццяўляючы дастаўку сваіх работ на Конкурс, удзельнікі даюць згоду на выкарыстанне творчых работ у інфармацыйных публікацыях, якія асвятляюць вынікі Конкурса.

20. Да ўдзелу ў Конкурсе не дапускаюцца работы, якія змяшчаюць: парушэнне патрабаванняў да зместу і афармлення, любыя формы невыканання этычных норм, рэлігійную і забароненую сімволіку, заахвочванне да здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў, ананімныя творчыя работы.

21. Атрыманыя творчыя працы пасля ўказанага тэрміну разглядацца не будуць.

22. Вынікі Конкурсу падводзяцца на пасяджэнні журы.

23. Пасяджэнне журы з’яўляюцца правамоцным пры ўдзеле большасці яе складу – не менш як 7 чалавек.

Усе рашэнні журы прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасці галасоў старшыні і членаў, якія прысутнічаюць на пасяджэнні. У выпадку роўнай колькасці галасоў “за” і “супраць” голас старшыні журы з’яўляецца вырашальным.

24. Пераможцы Конкурсу, якія занялі 1-е, 2-е і 3-е месцы, узнагароджваюцца дыпломамі першай, другой і трэцяй ступені адпаведна ў рамках і прызамі.

25. Вынікі Конкурсу падводзяцца да 1 чэрвеня 2026 г. на пасяджэнні журы і афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі членамі.

26. Журы Конкурсу мае права змяняць, аб’ядноўваць, вызначаць дадатковыя намінацыі ў межах выдзеленага прызавога фонду.

27. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

28. Фінансаванне расходаў на правядзенне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага” на цэнтралізаваныя культурныя мерапрыемствы

29. За кошт абласнога бюджэту фінансуецца набыццё прызоў, рамак для дыпломаў, выраб дыпломаў.

30. Фінансаванне Конкурсу можа здзяйсняцца за кошт іншых крыніц не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

31. Інфармацыя аб правядзенні Конкурсу і яго выніках публікуецца на сайтах упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама (https://kultura-grodno.by/) і ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага" (https://grodnolib.by/).

32. Творчыя працы, прадстаўленыя на Конкурс, аўтарам не вяртаюцца, будуць экспанавацца на выставах, адкрытых праглядах літаратуры, падчас мерапрыемстваў у ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага" і публічных бібліятэках Гродзенскай вобласці.

33. Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Конкурсу і арганізацыя выставы творчых работ адбудзецца ў рамках правядзення Х Абласнога фестывалю кнігі "Гродзенскі ЛітФэст" у г. Гродна.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці “Лэпбук – гісторыя #4Рэгіёна”

Склад арганізацыйнага камітэта
абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк
Гродзенскай вобласці “Лэпбук – гісторыя #4Рэгіёна”

| | | |
|---|---|---|
| Клімовіч Алена Віктараўна | - | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Ігнатовіч Марына Эдвардаўна | - | дырэктар ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”, *намеснік старшыні аргкамітэта;* |
| Бурулёва Наталля Аляксандраўна | - | вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”; |
| Касмоўская Алеся Аляксандраўна | - | бібліятэкар аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”; |
| Лемяноўская Ірына Казіміраўна | - | вучоны сакратар бібліятэкі ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”; |
| Пекар Анастасія Юр’еўна | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Сцяпанава Галіна Аляксандраўна | - | загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”. |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі
правядзення абласнога конкурсу сярод
публічных бібліятэк Гродзенскай
вобласці “Лэпбук – гісторыя #4Рэгіёна”

Склад журы
абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці
“Лэпбук – гісторыя #4Рэгіёна”

| | | |
|---|---|---|
| Клімовіч Алена Віктараўна | - | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы*; |
| Пекар Анастасія Юр’еўна | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні журы*; |
| Сцяпанава Галіна Аляксандраўна | - | загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”, *сакратар журы*; |
| Аляксандрава Дар’я Аляксандраўна | - | выкладчык цыклавой камісіі “Дызайн” УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў” |
| Бурулёва Наталля Аляксандраўна | - | вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага” |
| Бусловіч Караліна Аляксандраўна | - | мастак-афарміцель аддзела мастацтва ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”; |
| Ігнатовіч Марына Эдвардаўна | - | дырэктар ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”; |
| Кучынская Алена Віктараўна | - | загадчык аддзела даведачна-інфармацыйнай і краязнаўчай работы ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”; |
| Лемяноўская Ірына Казіміраўна | - | вучоны сакратар бібліятэкі ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага”. |

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі правядзення абласнога конкурсу сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці “Лэпбук – гісторыя #4Рэгіёна”

Форма заяўкі ўдзельніка

Аргкамітэт абласнога конкурсу
сярод публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці “Лэпбук – гісторыя #4Рэгіёна”

______________________________________

______________________________________

*назва бібліятэчнай сістэмы*

______________________________________

______________________________________

*назва структурнага падраздзялення*

______________________________________

______________________________________

______________________________________

*кантактная інфармацыя: паштовы адрас, нумар тэлефона, адрас электроннай пошты*

Заяўка на ўдзел

Прашу прыняць да разгляду творчую працу
______________________________________________________________
у намінацыі___________________________________________________

______________ ______________ ________________________

дата подпіс прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка